# «Духоўнае адраджэнне» ў кніжнай выставе

**«Вялікі талент, вялікая работа, вялікае сэрца»: менавіта так гучыць назва традыцыйнай кніжнай выставы ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі, якая прысвечана лаўрэатам прэміі «За духоўнае адраджэнне» і Спецыяльных прэмій Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**




Гэтая выстава складаецца штогод. Тут і кнігі з фондаў бібліятэкі, і выразкі з газетных нумароў, і выяўленчыя дакументы, і разнастайныя сувеніры — адным словам, усё, тэматычна звязанае з дзейнасцю лаўрэатаў.

Зладзіць экспазіцыю такога кшталту не так проста, як можа здацца на першы погляд. Па словах вядучага метадыста бібліятэкі Надзеі Кірчанка, тут патрэбна аператыўнасць, да таго ж яшчэ і карпатлівая праца па пошуку інфармацыі.







— Мы стараемся патрапіць на саму цырымонію. Там наш куратар гутарыць з лаўрэатамі. Яны дзеляцца нейкімі невялікімі сувенірамі: паштовачкамі, буклетамі, значкамі. Усё гэта потым уваходзіць у экспазіцыю, — расказвае Надзея Кірчанка.

Сёлета прэміі ўручаліся за актыўную дзейнасць у гуманітарнай галіне, у грамадзянска-патрыятычным выхаванні моладзі, за ўклад у захаванне культурнай спадчыны, а таксама за дасягненні ў тэатральным, музычным, дэкаратыўна-прыкладным і народным мастацтве. Усё гэта гарманічна адлюстравалася ў кніжнай экспазіцыі.









Напрыклад, стэнд, які прысвечаны калектыву дзяржаўнай установы «РНПЦ «Маці і дзіця», прадстаўляе не толькі кнігі і публіцыстычныя матэрыялы, але і невялікую ёлачную цацку: анёлак на драўляным кані. А міні-экспазіцыя, якая паведамляе пра дзейнасць «Полацкага кадэтскага вучылішча», радуе гледачоў гістарычнай літаратурай дарэвалюцыйных часоў і сучаснымі фотаздымкамі. Яны яшчэ і размешчаны зусім побач, быццам бы ствараючы стужку паміж часамі.




Наведаць гэтую выставу можна да 17 сакавіка. Яна размешчана ў кальцавой галерэі на другім паверсе.

**Лізавета ГОЛАД**